# Крыніца чалавечага жыцця

Квест-азбука можа быць выкарыстана настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры падчас правядзення прадметных тыдняў, мерапрыемстваў у рамках Міжнароднага дня роднай мовы, а таксама падчас падрыхтоўкі да прадметнай алімпіяды. Можна прайсці квест як у класе, так і самастойна. Сэнс заключаецца ў тым, што першая літара адпавядае парадкаваму нумару ў алфавіце (першае слова пачынаецца з літары "а", другое — з "б", трэцяе — з "в" і г.д.). Калі пачаць слова з пэўнай літары немагчыма, то яна знаходзіцца ў сярэдзіне слова. Заданні рэкамендуецца выконваць паслядоўна.

У працэсе распрацоўкі выкарыстана выданне "Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы" пад рэд. І.Л.Капылова (выдадзены Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, 2016 год), сучасныя падручнікі па беларускай мове.



**Варыянт 1**

1. Пакрыцца інеем з усіх бакоў. (***Аб'інець.***)
2. Страва, прыгатаваная з дранай бульбы. (***Бабка.***)
3. Які вабіць, зачароўвае сваім выглядам, прывабны. (***Вабны.***)
4. Прыбор для вызначэння часу ў межах сутак. (***Гадзіннік.)***
5. Прывітанне пры сустрэчы. *Падказка:* адно слова. (***Дабрыдзень.***)
6. Яловы лес. 2. Ссечаныя яловыя лапкі або дрэвы. (***Ельнік.***)
7. Зручна, добра. (***Ёмка.***)
8. Ахвотнік. (***Жадаючы.***)
9. Выклікаць ахвоту да чаго-небудзь, жаданне займацца чым-небудзь. (***Заахвоціць.***)
10. Падушачка або скрыначка для захоўвання швейных іголак. (***Ігольніца.***)
11. Слова "наименование" перакладаецца на беларускую мову як... (***Найменне.***)
12. Складальнік казак, асоба, якая расказвае казкі. (***Казачнік.***)
13. Спецыяльнае памяшканне для мыцця. (***Лазня.***)
14. Тое, што належыць каму-небудзь, знаходзіцца ў чым-небудзь уладанні, уласнасць. (***Маёмасць.***)
15. Паабяцаць вельмі многа. (***Наабяцаць.***)
16. Гаварыць, захоўваючы ў маўленні ненаціскное "о". (***Окаць.***)
17. Тое, што і абапал. (***Паабапал.)***
18. Слоўны абмен з кімсьці звесткамі, думкамі; гутарка. 2. Чуткі. 3. Мова, гаворка, вымаўленне (разм.). (***Размова.***)
19. Той, хто садзейнічае, дапамагае, спрыяе каму-небудзь, чаму-небудзь. (**Садзейнік**).
20. Шчыры, сяброўскі. (***Таварыскі.***)
21. Вечарам. (***Увечары, увечар.)***
22. Маленькая трава — гэта... (***Траўка.***)
23. Вусная народная творчасць, сукупнасць народных абрадавых дзеянняў. (***Фальклор.***)
24. Той, хто хадайнічае за каго-небудзь. (***Хадайнік.)***
25. Цэбар невялікага памеру. (***Цабэрак.***)
26. Чаму + -сьці. (***Чамусьці.***)
27. Кароткія панчохі, якія не даходзяць да калена. (***Шкарпэткі.***)
28. Сінонім да слова "прыгажосць". (***Эстэтыка.***)
29. Змрок, цемра. (***Шэрань.***)
30. Раней: загадчык панскай гаспадаркі. (***Эканом.***)
31. Перыяд жыцця пасля маленства да сталасці. (***Юнацтва.***)
32. Белы клён інакш называецца... (***Явар.***)

**Варыянт 2**

1. Абгарэлая астача (свечкі, бервяна і пад.). (***Агарак.***)
2. Падобнае на вату валакно. (***Бавоўна.***)
3. Які заслугоўвае чаго-небудзь або мае каштоўнасць. (***Варты.***)
4. Эканомны, руплівы, клапатлівы ў вядзенні гаспадаркі (пра чалавека). (***Гаспадарлівы.***)
5. Пажаданне спакойнай ночы. (***Дабранач.***)
6. Адзінства, згуртаванасць; агульнасць, супольнасць. (***Еднасць.***)
7. Зручны ў карыстанні. (***Ёмкі.***)
8. Беларускі і рускі народны інструмент у выглядзе дудкі з раструбамі. (***Жалейка.***)
9. Гульня, пацеха або тое, што забаўляе, весяліць. (***Забава.***)
10. Галіна сельскай гаспадаркі, якая займаецца вырошчваннем лёну; навука аб вырошчванні лёну. (***Ільнаводства.***)
11. Най + лепшы. (***Найлепшы.***)
12. Тое, што і кусок. (***Кавалак.)***
13. Даваць ласку. (***Лашчыць.***)
14. Чалавек, які павольна працуе. (***Маруда.***)
15. Тканіна з набіўным узорам. (***Набіванка.)***
16. Тое, што і вохра. (***Охра.***)
17. Слова бачыцца з прыстаўкай. (***Пабачыцца.***)
18. Бацькаўшчына, родная краіна. (***Радзіма.***)
19. Які змяшчае шмат соку. (***Сакавіты.***)
20. Які валодае талентам. (***Таленавіты.)***
21. Прыведзены ў парадак, упрыгожаны. (***Убраны.***)
22. Гэтай літары няма больш нідзе, акрамя беларускай мовы. (***Ў.***)
23. Трымацца з фанабэрыяй. (***Фанабэрыцца.***)
24. Задавальняць патрэбу арганізма ў ежы, сталавацца. (***Харчавацца.***)
25. Прадмет, прызначаны для працэджвання малака. (***Цадзілка.***)
26. Травяністая духмяная расліна. (***Чабор.***)
27. Абшываць шалёўкай. (***Шаляваць.)***
28. Имя прилагательное па-беларуску будзе ... (***Прыметнік.***)
29. Прамень+ чык. (***Праменьчык.***)
30. У беларускай мове ёсць такі выклічнік. (***Эх.***)
31. Навука, якая вывучае народ, асаблівасці яго культуры і побыту. (***Этнаграфія.)***
32. Дакладна, у самы раз. (***Якраз.)***

**Таццяна МОЙСА,**
**метадыст Дзяржынскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета.**
**Фота Вольгі ДУБОЎСКАЙ.**